КАДРАВЫЯ РАШЭННІ ПРЭЗІДЭНТА

Учора Аляксандр Лукашэнка прыняў шэраг кадравых рашэнняў. Новыя пасады занялі старшыні раённых і намеснікі старшынь абласных выканкамаў. Таксама прызначаны новыя пасол ва Узбекістане, кіраўнік «Беларусьфільма» і міністр.

З учарашняга дня міністрам спорту і турызму стаў Сяргей Кавальчук. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, — гэта чалавек ваенны і талковы. «Пакуль у нас у спорце больш праблем, чым перамог і поспехаў. Думай, глядзі, з кім працаваць, выбудоўвай сістэму. Але галоўнае — там не хапае дысцыпліны. Трэнерскі склад працуе вельмі дрэнна, за выключэннем некаторых», — адзначыў Прэзідэнт. І хоць трэнерам плануецца павышаць зарплату, але ад гэтага і нагрузка ўзмоцніцца, папярэдзіў ён.

Яшчэ адна задача, якую паставіў перад новапрызначаным міністрам Аляксандр Лукашэнка, — рухаць спорт у масы. У сваю чаргу, Сяргей Кавальчук заявіў, што шчыра падтрымлівае гэту ідэю, бо менавіта з масавага спорту могуць з'явіцца спартсмены-прафесіяналы. Да таго ж варта павышаць спартыўную культуру насельніцтва, укараняць здаровы лад жыцця так, каб ён станавіўся неад'емнай рэччу для кожнага беларуса. Як прызнаўся новы міністр, ён сам прытрымліваецца такой пазіцыі, пастаянна займаецца рознымі відамі спорту — футболам, валейболам, баскетболам. У такое марознае надвор'е любіць хадзіць на лыжах, што і робіць некалькі разоў на тыдзень.

На пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Узбекістан Прэзідэнт прызначыў Леаніда Марыніча. Кіраўнік дзяржавы сарыентаваў новага дыпламатычнага прадстаўніка нашай краіны на тое, што яго задача не столькі хадзіць на прыёмы, колькі працаваць над развіццём гандлёва-эканамічных адносін нашых краін. На думку Прэзідэнта, беларускія тэхналогіі і прадукцыя будуць запатрабаваны ва Узбекістане. «Мы павінны дапамагаць ім (народу Узбекістана. — **«Зв.»**) ва ўсім, гэта не чужыя нам людзі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне новых старшынь райвыканкамаў і намеснікаў аблвыканкамаў. Іх кіраўнік дзяржавы перш за ўсё скіраваў на развіццё эканомікі рэгіёнаў. Бо калі не будзе вытворчасці і занятых на ёй людзей, адкуль узяцца дастойнай зарплаце? «Вы думайце, як не проста захаваць вытворчасць, а каб яна была рэнтабельнай, каб пазбегнуць гэтых страт. Таму пастарайцеся аб'яднаць усё ў адзін кулак і атрымаць вынік. Эканоміка і яшчэ раз эканоміка — гэта найважнейшае пытанне», — сказаў Прэзідэнт. Асабліва гэта датычыцца сельскагаспадарчай вытворчасці, над якой сёлета трэба максімальна папрацаваць.

Асобна кіраўнік дзяржавы заклікаў звяртаць увагу на кадры, у тым ліку адносна прыватных прадпрыемстваў. І крый божа, прадстаўнікі мясцовай улады будуць заўважаны ў карупцыйных схемах. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта недапушчальна і такая палітыка Прэзідэнта нязменная. Таксама ён заклікаў сачыць за ўсім, што адбываецца на месцах, трымаць на кантролі ўсе працэсы. «Глядзіце, каб на вас не крыўдзіліся людзі, і не рабіце таго, з-за чаго потым будзе сорамна не толькі вам, але і вашым дзецям», — сказаў беларускі лідар.

Віктар Атліванаў прызначаны старшынёй Жыткавіцкага райвыканкама, Павел Сілівончык — старшынёй Нараўлянскага райвыканкама, Сяргей Гвоздзь — старшынёй Калінкавіцкага райвыканкама, Дзяніс Альшэўскі — старшынёй Зэльвенскага райвыканкама, Генадзь Хоміч — старшынёй Слонімскага райвыканкама, Іван Крупко — старшынёй Мінскага райвыканкама, Генадзь Салавей — старшынёй Нясвіжскага райвыканкама, Аляксандр Ломскі — старшынёй Клецкага райвыканкама, Анатоль Козел — старшынёй Крупскага райвыканкама, Сцяпан Чачуха — старшынёй Глускага райвыканкама, Дзмітрый Гатоўчык — старшынёй Дрыбінскага райвыканкама.

Намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама стаў Вадзім Альшэўскі, намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама — Руслан Пархамовіч. Таксама Аляксандр Кавальчук цяпер з'яўляецца членам Мінскага аблвыканкама, а Ігар Шчарбачэня — Магілёўскага.

Намеснікам старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь кіраўнік дзяржавы прызначыў Юрыя Кабца. Прэзідэнт таксама даў згоду на прызначэнне дырэктарам дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Андрэя Молчана. Алег Барысенка прызначаны генеральным дырэктарам «Гомельтранснафта Дружба». Нацыянальную кінастудыю «Беларусьфільм» цяпер узначальвае Уладзімір Карачэўскі.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ГЕРОІ СПОРТУ. СЁННЯШНІЯ І ЗАЎТРАШНІЯ

У нядзелю ў Раўбічах завяршыўся фінальны этап рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне «Снежны снайпер». Пераможцы былі вызначаны ў трох узроставых катэгорыях. У турніры прынялі ўдзел юныя біятланісты з усіх рэгіёнаў Беларусі — у цэлым 168 хлопчыкаў і дзяўчынак. Усяго ў гэтым сезоне ў «Снежным снайперы» прыняло ўдзел больш за 39 тысяч дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі. Прычым у спаборніцтвах не ўдзельнічалі падлеткі, якія навучаюцца ў спецыялізаваных вучэбна-спартыўных установах па біятлоне і лыжных гонках.

Узнагароды юныя спартсмены атрымалі з рук кіраўніка дзяржавы і алімпійскіх чэмпіёнаў Дар'і Домрачавай, Ірыны Крыўко і Дзінары Алімбекавай. Таксама быў арганізаваны паказальны біятлонны забег, у якім разам з Аляксандрам Лукашэнкам прынялі ўдзел вядомыя беларускія спарстмены.

Падчас размовы з журналістамі Прэзідэнт звярнуў увагу на актуальныя пытанні развіцця айчыннага спорту. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка расказаў аб намеры правесці прынцыповую размову з кіраўнікамі федэрацый зімовых відаў спорту. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што беларускія спартсмены хоць і заваявалі некалькі медалёў на зімовай Алімпіядзе, але маглі паказаць лепшыя вынікі, у прыватнасці ў біятлоне і фрыстайле. На думку Прэзідэнта, трэнерскі склад недастаткова добра падрыхтаваў спартсменаў да алімпійскага старту. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена падрыхтоўцы мужчынскай біятлоннай каманды, якая не змагла паказаць дастойныя рэзультаты ў Пхёнчхане.

Адказваючы на пытанне аб выступленні Антона Кушніра на галоўных стартах чатырохгоддзя, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што вызначаецца форум, дзе будзе ўзнята адпаведная праблема. «Хутчэй за ўсё, гэта будзе пасяджэнне Асацыяцыі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў (АНАК). Трэба ім у вочы адкрыта сказаць, што нікому няма справы да атлетаў. Спіхваюць адзін на аднаго, і пляваць ім на гэтых спартсменаў. Збіраюцца вузкай кучкай і нешта там вырашаюць. Усё забюракратызавана так, што цяжка разабрацца. Зламалі алімпійскага чэмпіёна Антона Кушніра. Упэўнены, калі б выйшаў ён у фінал, то быў бы з медалём. Ды і мы другі медаль у мужчынскай лыжнай акрабатыцы ўпусцілі. Не трэба было Станіславу Гладчанку скакаць такую складаную праграму, спрасці свой скачок — і на трэцім месцы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Закрануў кіраўнік дзяржавы і «хакейную» тэму. На яго думку, асноўная прычына нявыхаду «Дынама-Мінск» у плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі ў дзясятым сезоне — правальнае міжсезонне. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падтрымаў галоўнага трэнера «зуброў» Гордзі Дуаера. «Ён адданы сваёй справе чалавек. Гордзі сам хоча ў нас працаваць і можа». Прэзідэнт нагадаў, што ў «Дынама-Мінск» раней увялі ліміт на легіянераў. «Не трэба нам ствараць тры пяцёркі ў камандзе іншаземцаў, няхай гэта будзе адзін, але ён навучыць беларускіх ігракоў. Няхай айчынныя хакеісты стараюцца і выступаюць у «Дынама». Уведзена строгая сістэма: з беларускіх клубаў найлепшыя трапляюць у «Дынама». Неабходны час, каб гэта сістэма ўстаялася і пачала працаваць», — адзначыў Прэзідэнт.

Гаворачы аб спаборніцтвах «Снежны снайпер», Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Каштоўнасць гэтых спаборніцтваў у тым, што гэтыя найлепшыя дзеткі, гэтыя зярняткі нашай краіны, узяты на кантроль трэнерамі. Мы абавязкова зробім усё, каб з іх у будучым выраслі Домрачавы, Б'ёрндалены, Айдаравы, Паповы — вялікія спартсмены, — заявіў ён. — Рыхтуйцеся па ўсіх відах спорту правесці такія спаборніцтвы».

Паводле БЕЛТА.

ЦЕПЛАПУНКТ У 3D, або ЖКГ-сімулятар

Памылкі без наступстваў

Такія амбіцыйныя планы ставіць перад сабой Кацярына ГАРБАЧОВА, дырэктар установы дадатковай адукацыі дарослых «Дзяржаўны цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў «Жылкам». Літаральна праз месяц цэнтр зменіць адрас і пачне функцыянаваць у больш прыдатных умовах, дзе зможа стаць «рэсурсным цэнтрам для навучання спецыялістаў сістэмы ЖКГ». Менавіта так прапісана задача ўстановы ў канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі да 2025 года.

У той жа час цэнтр збіраецца стаць пляцоўкай і для падрыхтоўкі спецыялістаў іншых устаноў адукацыі, якія вучаць роднасным прафесіям. Гэта спецыяліст па комплексным абслугоўванні, слесар-сантэхнік, работы зялёнага будаўніцтва і іншыя. Неўзабаве тут з'явяцца спецыялізаваныя класы: па другасных матэрыяльных рэсурсах, энергаэфектыўным абсталяванні, цеплавой, водаправодна-каналізацыйнай, электрычнай, ліфтавай гаспадарках.

— Заняткі будуць праводзіцца на сапраўдным абсталяванні, наглядна будуць прадстаўлены цеплавыя пункты, макеты цеплавузлоў і іншае. Без інтэрактыўнага развіцця цяпер ніяк, — упэўнена Кацярына Гарбачова. — Свой праграмны комплекс абслугоўвання будынкаў (ПКАБ) мы распрацоўвалі год. Ствараўся ён з мэтай мінімізаваць затраты на навучанне спецыялістаў на прадпрыемствах, а таксама каб зменшыць выдаткі на абсталяванне для навучання. Няправільнае дзеянне ў цеплапункце на працуючым абсталяванні — гэта выхад са строю дарагой помпы ці іншай прылады. Наш трэнажор дазваляе рабіць памылкі без наступстваў для дома.

Максімальнае пагружэнне

Трэнажор будзе карысны для многіх камунальных прафесій: ад рабочага па комплексным абслугоўванні будынкаў да галоўных інжынераў, гаворыць Кацярына Гарбачова. Праграма дазваляе дэталёва вывучыць цеплапункт, скрупулёзна разгледзець кожную дэталь абсталявання. Прычым мадэль кожнай прылады можна паглядзець у 3D-праекцыі, пакруціць у розныя бакі, убачыць яе знутры ў разрэзе, «памацаць».

— Трэніроўка спачатку праходзіць у рэжыме навучання, калі чалавек наглядна знаёміцца з абсталяваннем цеплавузла. Пасля азнаямлення выкладчык прапануе выканаць нейкае дзеянне на трэнажоры. Пры гэтым ён задае пэўныя параметры: колькасць паверхаў, нагрузку і іншыя ўводныя, ад якіх будуць залежаць дзеянні студэнта ў цеплапункце. Пры няправільных дзеяннях трэнажор адразу пакажа, што ты нарабіў: пойдзе пара, зашыпіць абсталяванне, пацячэ вада. Мы хочам, каб кожны максімальна пагрузіўся ў тое асяроддзе, з якім яму давядзецца працаваць, — расказала дырэктар. — Дзякуючы такому навучальнаму абсталяванню, цяпер не трэба перажываць, што ў галіну трапіць нейкі недаспецыяліст і пачне давучвацца і трэніравацца на рабочых прыладах у рэальным цеплавузле.

Трэнажор для галоўнага інжынера

Пакуль што сімулятар праходзіць тэсціраванне, і першая група камунальнікаў пачне заняткі на ім з красавіка. У цэнтры хочуць максімальна задзейнічаць у навучанні ўсіх: не толькі навучэнцаў пасля ПТВ, але і дзеючых спецыялістаў — майстроў, дырэктараў і галоўных інжынераў, каб яны праверылі сябе.

— Добра вучыцца метадам спроб і памылак, калі іх можна пасля спакойна прааналізаваць з выкладчыкам, а не сапсаваць абсталяванне. А яно ў працэсе работы мяняецца, з'яўляюцца новыя прыборы. І дзе вывучыць усе гэтыя дэталі, даведацца, як яны працуюць, як не тут, на трэнажоры, каб ісці ў нагу з часам, — разважае Кацярына Гарбачова. — ЖКГ, як і медыцына, побач з людзьмі ўсё іх жыццё. Калі правесці аналогію, то людзі сустракаюцца з жыллёва-камунальнай паслугай — вадой — пасля нараджэння ў радзільным доме і заканчваюць шлях паслугамі пахавання, якімі таксама займаюцца камунальнікі. Не заўсёды можна дакладна вызначыць, што баліць у арганізме чалавека. Так і з домам. Сёння гэта найскладанейшая інжынерная канструкцыя. І спецыяліст павінен мець адпаведны высокі ўзровень ведаў, каб усё гэта абслугоўваць.

Сімулятар — гэта не канчатковы прадукт. Са з'яўленнем новых прылад і прыстасаванняў усе яны будуць дадавацца ў трэнажор. На чарзе ўжо, напрыклад, элементы дыспетчарызацыі. Пакуль трэнажор уяўляе сабой візуальную інтэрактыўную панэль для заняткаў, але ў планах спецыялістаў цэнтра аснасціць яго магчымасцю займацца ў віртуальнай рэальнасці. Дадаць сюды акуляры і пальчаткі для максімальна поўнага пагружэння ў віртуальнасць і дасягнення эфекту, што ты сапраўды ўвайшоў у дзеючы цеплапункт.

— Сістэма абслугоўвання дома ў плане цеплазабеспячэння, якая прадстаўлена ў сімулятары, — гэта толькі адна з 12 асноўных камунальных паслуг галіны ЖКГ. У будучым трэнажор будзе развівацца і па іншых спецыяльнасцях. Ужо ставіцца задача «падняцца з падвала ў дом». Паказаць, як рухаецца вада па стаяках. З'явіцца візуалізацыя ліфтаў, электраправодкі і іншае, — дадала спецыяліст.

Навучыцца размаўляць

Паколькі дагэтуль існуе пэўнае непаразуменне ў зносінах камунальнікаў і жыхароў, у цэнтры распрацавалі яшчэ адну праграму па навучанні спецыялістаў рабоце з насельніцтвам. Яна прадугледжвае тыднёвы курс навучання. Сюды ўваходзіць псіхалагічны блок па кліентаарыентаванні, работа ў стрэсавай сітуацыі, тайм-менеджмент па арганізацыі свайго часу і часу стасункаў з кліентамі. А таксама базавы курс па асноўных камунальных паслугах, каб можна было максімальна даступна растлумачыць жыхару, якая паслуга яму аказваецца і што з сябе ўяўляе. Спецыяліст простай і зразумелай мовай будзе тлумачыць усё гэта. Пакуль толькі мінчане будуць атрымліваць такую паслугу, пасля яе распаўсюдзяць на ўсю краіну.

— Пасля выпуску першай групы мы плануем пратэсціраваць іх, каб зразумець, чаго не хапіла ў гэтым курсе, а чаго наадварот, занадта. Мы хочам, каб было і нашаму спецыялісту камфортна працаваць, і чалавеку зручна яго разумець. Прафесіяналы навучацца карэкціраваць канфліктную сітуацыю, дамаўляцца з чалавекам, — расказала яна. — Яны стануць працаваць з псіхолагамі, будуць праводзіцца трэнінгі і круглыя сталы.

Ужо распрацавана праграма псіхалагічнага тэсціравання для спецыялістаў сістэмы ЖКГ. Сёння яго праходзяць кіраўнікі і спецыялісты падчас прафесійнай атэстацыі.

Мяркуецца, што пасля новай перападрыхтоўкі спецыялісты змогуць і растлумачыць алгарытм налічэння «камуналкі», і расказаць, з чаго складаюцца тарыфы, як робіцца перараслік аплаты, чаму не сыходзяцца паказчыкі па вадзе, адкуль столькі «набегла» за святло і іншыя «спажывецкія дробязі», якія вельмі актуальныя і хвалюючыя для людзей.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)